# ШЧАСЛІВАЙ ДАРОГІ, ПЕРШАКУРСНІК!


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 26 (1213) ● 31 жніўня 1978 г. Цана 2 кап.


— Здзейснілася!

Сёння ты ўпершыню пераступіў парог універсітэта ў законным званні студэнта, якое атрымаў, пераадолеўшы рыфы і віры ўступных экзаменаў, і ўвальешся ў вясёлую і няўрымслівую сям'ю, імя якой — студэнцтва. Гэта ты заменіш у сценах універсітэта выпускнікоў, якія разляцеліся адсюль па вясне. Яны сёння зайздросцяць табе, як і кожны, хто праходзіць які-небудзь пэўны жыццёвы шлях, абавязкова зайздросціць тым, хто стаіць у яго пачатку, і жадае не паўтараць уласных памылак.

Не паўтарай!

Не, паўтарай. Бо чужы вопыт не вучыць, чужыя парады рэдка дапамагаюць, а дарога, на якой не наб'еш сабе ніводнага сіняка, застанецца прагулачнай сцежкай, а не жыццёвым шляхам.

Дык ідзі — і набівай уласныя сінякі.

Ты вельмі здзівішся, калі табе скажуць, што менна гэта выдае зялёнага першакурсніка. Потым ты пасталееш і сам даведаешся, чым заканчваюцца пабегі з семінарскіх і што значыць ісці на экзамен з чужым канспектам...

Ты адчуеш бескарыслівасць студэнцкага сяброўства, цябе ўсхвалюе першае «выдатна» ў тваёй залікоўцы, запомніцца першы выклік у дэканат...

Усё ў цябе яшчэ будзе: першая аўдыторыя, першая лекцыя, першая стыпендыя, першая сесія, першыя няўдачы, цяжкасці, сумненні: а ці правільна я выбраў шлях! І ўпэўненасць — правільна!

Не вер, што студэнцкія гады ляцяць хутка і непрыкметна. Сапраўдны студэнт іх заўважыць, запомніць, задумаецца.

А ты абавязкова будзеш сапраўдным студэнтам.



# КРАІНА ВЕДАЎ ПРЫМАЕ ВАС!




Пяцьдзесят сёмы раз наш універсітэт гасцінна адчыняе дзверы перад студэнтамі. Гэты навучальны год асаблівы. Ён пачынаецца ў год 60-годдзя ВЛКСМ, 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі.

У адзінай сям'і брацкіх народаў, цесна з'яднаных вакол Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, беларускі народ сустракае свой слаўны юбілей у росквіце творчых сіл, перапоўнены пачуццём гонару за дасягнутае і здзейсненае за гады Савецкай улады.

Калектыў універсітэта, як і ўвесь беларускі народ, бачыць свой доўг у тым, каб з поўнай аддачай сіл працаваць над здзяйсненнем пастаўленых партыяй велізарных задач камуністычнага будаўніцтва па падрыхтоўцы ва універсітэце высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, навукі і культуры.

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад праяўляюць пастаянны клопат аб вышэйшай школе, не шкадуюць сіл і сродкаў на вышэйшую адукацыю. У рашэннях па пытаннях падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацы-


А. Я. МАЛЫШАЎ,
прафесар,
в. а. рэктара БДУ


-ай партыя і ўрад патрабуюць глядзець наперад, разумець, што работа вышэйшай школы на сучасным этапе павінна быць накіравана ў будучыню.

Новай яркай праявай вялікай увагі да жыцця і спраў вышэйшай школы з'яўляецца прывітанне таварыша Л. І. Брэжнева ўдзельнікам урачыстага сходу, прысвечанага 90-годдзю рэвалюцыйнай сходкі казанскіх студэнтаў. У гэтым прывітанні таварыш Л. І. Брэжнеў напомніў аб пярвейшым абавязку і ганаровай місіі вышэйшай школы — рыхтаваць спецыялістаў, дастойных нашай эпохі, сапраўдных арганізатараў і выхавацеляў мас, патрыётаў і інтэрнацыяналістаў, у дасканаласці валодаючых асновамі сучаснай навукі, такіх, што вызначаюцца глыбокай камуністычнай перакананасцю і высокімі маральнымі якасцямі.

Сёння каля памятнага Знака выкладчыкам і студэнтам універсітэта, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, адбудзецца ўрачыстае пасвячэнне першакурснікаў у студэнты, а заўтра на ўсіх факультэтах празвініць першы званок, тысячы юнакоў і дзяўчат запоўняць прасторныя і светлыя аўдыторыі, і пачнуцца звычайныя студэнцкія будні.

Вучыцца ва універсітэце, які носіць імя вялікага Леніна, змагацца за званне ўзорнай ВНУ — вялікі гонар. Але гэта накладвае на ўсіх студэнтаў і вялікія абавязкі. Галоўны з іх — старанна вучыцца, настойліва ўзнімацца да вяршынь ведаў. Паспяховая вучоба — гэта пярвейшы доўг, асноўны ўклад кожнага студэнта ў дзесятую пяцігодку.

За час вучобы ва універсітэце кожны студэнт павінен атрымаць трывалыя веды па фундаментальных навуках і па спецыяльнасці. Неад'емнай часткай ведаў спецыяліста любога профілю з'яўляецца глыбокае авалоданне марксісцка-ленінскім вучэннем, вывучэнне дакументаў КПСС, выпрацоўка класавага падыходу да з'яў і падзей грамадскага жыцця, уменне аргументавана крытыкаваць антымарксісцкія погляды.

У сучасных умовах, калі аб'ём неабходных для чалавека ведаў рэзка расце, кожны студэнт за час вучобы ва універсітэце павінен набыць уменне і навыкі самастойна папаўняць свае веды, арыентавацца ў імклівым патоку навуковай і палітычнай інфармацыі. І гэта ўменне трэба набываць з першых дзён вучобы. Тым больш, што метады навучання ў сярэдняй школе і ў ВНУ рэзка адрозніваюцца.

Ва ўмовах буйна працякаючага навукова-тэхнічнага прагрэсу нельга стаць добрым спецыялістам без удзелу ў навукова-даследчай рабоце. Для гэтага ва універсітэце маюцца ўсе ўмовы. Доўг кожнага студэнта — з першага курса актыўна ўключыцца ў НДР. Звычайна першакурснікі не задумваюцца над тым, што ім прыйдзецца не толькі вучыцца. Але кожны з іх, відаць, ужо чуў пра студэнцкія будатрады, сустракаўся з выпускнікамі ВНУ, якія выступалі перад школьнікамі з лекцыямі і канцэртамі мастацкай самадзейнасці. Усё гэта — шматгранная грамадска-палітычная работа, якой займаюцца ўсе студэнты. Вось і табе, першакурснік, неабходна адразу выбраць справу па душы, каб навучыцца кіраваць людзьмі, весці на прадпрыемстве, дзе ты будзеш працаваць пасля заканчэння БДУ, выхаваўчую работу. У гэтым табе дапамогуць факультэт грамадскіх прафесій, школа маладога лектара, грамадска-палітычная практыка, гурткі мастацкай самадзейнасці і г. д.

Навукова-тэхнічны прагрэс, вялікі рост вытворчасці, дасягнуты нашай краінай у дзесятай пяцігодцы, паставілі новыя, яшчэ больш складаныя задачы перад вышэйшай школай.

Атрыманне студэнцкага білета — гэта толькі пачатак твайго студэнцкага шляху, на якім будзе нямала цяжкасцей. Пераадолей іх, дасягні пастаўленай перад сабой мэты. Мы верым у цябе і жадаем табе вялікіх поспехаў у вучобе, цікавых знаходак і адкрыццяў на шляху, які сёння пачынаецца!



# Дарагія першакурснікі!

Сёння вы сталі студэнтамі універсітэта, большасць з вас улілася ў нашу амаль 11-тысячную камсамольскую арганізацыю. Знамянальным зяўляецца тое, што новае папаўненне да нас прыйшло напярэдадні 60-годдзя Ленінскага камсамола, у год слаўнага юбілею Беларусі і Кампартыі рэспублікі. Каму, як не вам, працягваць слаўныя традыцыі мінулых камсамольскіх год, вырашаць задачы, пастаўленыя XXV з'ездам КПСС і XVIII з'ездам ВЛКСМ.

Гісторыя камсамольскай арганізацыі пачынаецца адразу ж пасля адкрыцця ў 1921 годзе Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Ад першай камсамольскай ячэйкі на рабочым факультэце, якая складалася з некалькіх чалавек, да адной з буйнейшых арганізацый Беларусі — такі сённяшні шлях камсамоліі універсітэта. І з тых далёкіх дзён яе дзейнасць была накіравана на выхаванне новай, рабоча-сялянскай, савецкай інтэлігенцыі, на здзяйсненне культурнай рэвалюцыі ў нашай рэспубліцы.

Камсамольцы актыўна ўдзельнічалі ва ўсіх гаспадарчых і палітычных кампаніях, якія праходзілі ў краіне. Яны вытрымалі экзамен на грамадскую сталасць, удзельнічаючы ў нядзельніках, аказваючы дапамогу галадаючым, ведучы барацьбу з дзіцячай безнагляднасцю, ліквідуючы непісьменнасць сярод насельніцтва, працуючы ў падшэфных вёсках. У 30-я гады камсамольская арганізацыя заклікала ўсіх студэнтаў упарта авалодваць ведамі з мэтай паляпшэння падрыхтоўкі кадраў інжынерна-тэхнічнай і навуковай інтэлігенцыі, умацоўваючы сувязь навуковых даследаванняў з патрабаваннямі сацыялістычнага будаўніцтва.

Суровую праверку на палітычную сталасць прайшла наша камсамольская арганізацыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Сотні яе выхаванцаў аддалі свае жыцці ў барацьбе з фашызмам.

У пасляваенныя гады разам з вялікай работай па павышэнню паспяховасці і прыцягненню студэнтаў да навуковай работы наша камсамольская арганізацыя ўнесла вялікі ўклад у асваенне цалінных зямель і будаўніцтва ў аддаленых сельскіх раёнах БССР і краіны. Больш як 2100 байцоў студэнцкіх будаўнічых атрадаў працавала сёлета на будоўлях Мінска і Мінскай вобласці, Малдавіі і Карэліі, Кіргізіі і Комі АССР, на БАМе, у Пскоўскай вобласці і ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. Працоўнае выхаванне стала магутным рычагом ідэалагічнай работы камітэта камсамола, ударнай справай кожнага студэнта універсітэта.

Шматграннай стала шэфская работа студэнтаў на прадпрыемствах, у калгасах, воінскіх часцях і асабліва ў сельскіх і гарадскіх сярэдніх школах. Студэнты-камсамольцы выступаюць з лекцыямі і дакладамі, канцэртамі мастацкай самадзейнасці, папаўняюць бібліятэкі сабранымі кнігамі, арганізуюць алімпіяды, канферэнцыі чытачоў, вечары адпачынку, экскурсіі, спартыўныя паядынкі, дапамагаюць афармляць стэнды нагляднай агітацыі, рыхтуюць моладзь да паступлення ў ВНУ і г. д.

Камсамольская арганізацыя не ўпускае з поля зроку і культурна-масавую работу, якая з'яўляецца састаўной часткай камуністычнага выхавання моладзі. На кожным факультэце ёсць свае агітбрыгады, плённа працуюць універсітэцкія калектывы мастацкай самадзейнасці.

Неад'емнай часткай камсамольскага жыцця стала спартыўна-масавая работа. Дзейнічаюць секцыі па большасці відаў спорту, сотні ўдзельнікаў прыцягвае круглагадавая спартакіяда, нашы студэнты з'яўляюцца членамі зборных

# ЗА ПРАВА БЫЦЬ УЗОРНЫМ

Па прыкладу масквічоў станкабудаўнікі завода імя С. М. Кірава вырашылі працаваць пад дэвізам «60-годдзю утварэння Савецкай Беларусі і Кампартыі рэспублікі — узорнае рабочае месца, цэх, вытворчасць!».

Бюро Мінскага гаркома КП Беларусі, выканком гарадскога Савета народных дэпутатаў, прэзідыум аблсаўпрофа і бюро гаркома ЛКСМБ адобрылі ініцыятыву станкабудаўнічага завода імя С. М. Кірава і рэкамендавалі партыйным і савецкім органам, прафсаюзным і камсамольскім арганізацыям правесці ва ўсіх калектывах шырокую растлумачальную і арганізатарскую работу па распаўсюджанню гэтай ініцыятывы.

Прапанавана разгарнуць масавае спаборніцтва за прысваенне звання ўзорных прадпрыемствам, арганізацыям, установам горада Мінска.

Калектыў нашага універсітэта падтрымаў гэтую ініцыятыву. На савеце БДУ вырашана ва ўсіх падраздзяленнях універсітэта разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва за права быць узорнай ВНУ.

Першыя вынікі будуць падведзены ў снежні. Ацэнка вынікаў спаборніцтва будзе вызначацца наступнымі крытэрыямі:

**Для вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў:**

Забеспячэнне ў час прыёму ў ВНУ і тэхнікумы юнакоў і дзяўчат, якія маюць высокі ідэйна-тэарэтычны і агульнаадукацыйны ўзровень. Планаванне вучэбна-выхаваўчага працэсу, якое забяспечыла б творчы характар навучання, выпрацоўвала ў студэнтаў патрэбу і навыкі пастаяннага ўдасканалення і папаўнення набытых ведаў у адпаведнасці з запытаннямі вытворчасці, з патрабаваннямі жыцця. Фарміраванне здольнасцей да самастойнай навукова-даследчай работы. Рэалізацыя прынцыпаў спалучэння агульнатэарэтычнай і спецыяльна-прафесіянальнай, прыродазнаўча-навуковай і гуманітарнай падрыхтоўкі спецыялістаў, актыўнае прыцягненне студэнтаў ВНУ да выканання гасдагаворных работ.

Укараненне новых форм і метадаў навучання, элементаў навуковай арганізацыі навучальнага працэсу, сродкаў яго інтэнсіфікацыі, сістэматычная работа па азнаямленню з навейшымі дасягненнямі навукі і тэхнікі як студэнтаў, так і прафесарска-выкладчыцкага саставу. Павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў шляхам спалучэння навучання з вытворчай працай, пастаяннага ўдасканалення зместу і форм вытворчай практыкі студэнтаў, выхавання якасцей арганізатараў вытворчасці і ідэйна-выхаваўчай работы ў працоўным калектыве.

Развіццё навуковых даследаванняў фундаментальнага характару, забеспячэнне высокай эфектыўнасці выкарыстання іх вынікаў у вытворчасці і навучальным працэсе. Наяўнасць сістэмы падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі навукова-педагагічных работнікаў, высокі ўзровень навуковай, метадычнай і ідэйна-тэарэтычнай падрыхтоўкі аспірантаў, шырокае прыцягненне прафесарска-выкладчыцкага саставу і аспірантаў да масава-палітычнай і прапагандысцкай работы ў працоўных калектывах і па месцу жыхарства насельніцтва.

Наяўнасць сістэмы камуністычнага выхавання студэнтаў, якая грунтуецца на рэалізацыі планаў ідэйна-выхаваўчай работы на ўвесь перыяд навучання і накіраванай на фарміраванне ў будучых спецыялістаў марксісцка-ленінскага светапогляду, камуністычнай перакананасці і высокіх маральных якасцей, актыўнае прыцягненне студэнтаў да шэфскай работы.

Утрыманне навучальных устаноў, прылягаючых тэрыторый ва ўзорным парадку, наяўнасць ідэйна вытрыманага, педагагічна мэтазгоднага і высокамастацкага ўнутранага і знешняга афармлення вучэбных і лабараторных карпусоў, інтэрнатаў. актыўная работа насценнага друку.

Падвядзенне вынікаў сацспаборніцтва і выяўленне пераможцаў здзяйсняецца камісіяй па арганізацыі сацспаборніцтва.

Дырэктарам навукова-даследчых інстытутаў, дэканам факультэтаў, загадчыкам лабараторый і кафедр, начальнікам аддзелаў і служб здзейсніць канкрэтныя меры па разгортванню спаборніцтва за права быць узорнымі.

Вынікі агульнауніверсітэцкага сацыялістычнага спаборніцтва падвесці ў лістападзе 1978 года.

ІНТЭРВ'Ю НУМАРА

# Хто прыйшоў у

**Вось і скончыліся экзаменацыйныя хваляванні, прайшла гарачая пара для абітурыентаў. Самыя шчаслівыя з іх заўтра ўпершыню з поўным правам прыйдуць ва універсітэцкія аўдыторыі, сядуць за парты — бо яны нарэшце дасягнулі сваёй мэты, сталі студэнтамі. Хто ж ідзе да нас ва універсітэт, што ўяўляюць сабой маладыя людзі, якія падаюць дакументы ў нашу ВНУ! Сваімі ўражаннямі аб абітурыенце-78 дзеліцца адказны сакратар прыёмнай камісіі, дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі А. А. ЛАБУДА:**

— Абітурыенты, якія паступалі ў БДУ імя У. І. Леніна,— гэта у асноўным выпускнікі сярэдніх школ, тэхнікумаў і вучылішчаў гэтага года. Думаю, што гэта найбольш падрыхтаваныя юнакі і дзяўчаты, бо агульны сярэдні бал атэстата быў 4,5—5,0. Сярод паступаючых больш 700 чалавек скончылі школу з залатым медалём.

На мой погляд, узровень падрыхтоўкі абітурыентаў у гэтым годзе добры. Аднак належыць адзначыць, што многія выпускнікі школ не вельмі сур'ёзна ставяцца да рускай мовы і літаратуры: якасць сачыненняў магла б і павінна быць лепшай.

**— Які конкурс у сярэднім быў у гэтым годзе на ўсе факультэты універсітэта!**

— У сярэднім конкурс на дзённае аддзяленне складаў 2 чалавекі на месца. Гэта некалькі ніжэй, чым у мінулым годзе. Растлумачыць гэта можна тым, што сказаўся адток сельскай моладзі ў вучылішчы. Аднак калі ўлічыць, што 15 працэнтаў месц занялі выпускнікі падрыхтоўчага аддзялення, а на астатнія месцы прэтэндавала прыкладна трэцяя частка медалістаў, то конкурс складаў 3—4 чалавекі на месца, а па асобных спецыяльнасцях, такіх, як правазнаўства, біялогія, біяхімія, генетыка, конкурс даходзіў да 5—8 чалавек на месца.

**— Што Вы можаце сказаць аб абітурыентах, якія паступалі на вячэрняе аддзяленне універсітэта! Ці намнога меншы быў конкурс у вячэрнікаў!**

— Конкурс на вячэрняе аддзяленне складаў 1,4 чалавека на месца. Што датычыць такіх спецыянальнасцей, як фізіка, матэматыка і хімія, то сума пададзеных заяў была меншай, чым колькасць планавых месц.

**— З якімі цяжкасцямі прыходзілася сустракацца прыёмнай камісіі! Раскажыце аб асаблівасцях яе работы.**





